ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

10 КАСТРЫЧНІКА 1996 года чацвер

№14 (1750)

*Віншуем!*

## Альма-матэр афіцэраў запасу



Вячаслаў Сяргеевіч Трафімычаў, палкоўнік, начальнік ваеннай кафедры Белдзяржуніверсітэта. Службу праходзіў у розных рэгіёнах былога Саюза. Ягоны дэвіз — ісці наперад, не спыняцца на дасягнутым, дамагацца большага.

**— Вячаслаў Сяргеевіч, напачатку дазвольце павіншаваць Вас, калектыў з 70-годдзем са дня ўтварэння ваеннай кафедры! Пажадаць моцнага здароўя і новых перамог у справе падрыхтоўкі афіцэраў запасу з ліку студэнтаў. Згадзіцеся, 70 год — гэта гісторыя. А як стваралася ваенная кафедра?**

— Паводле дакументаў, кафедра была ўтворана 4 лістапада 1926 года. Гэта была адзіная кафедра, задача якой была ў тым, каб рыхтаваць спецыялістаў для арміі. Да навучання студэнтаў прыцягваліся лепшыя выкладчыкі ВНУ, а таксама афіцэры і генералы ваеннай акругі. Мы ганарымся, што на кафедры на працягу двух гадоў чыталі лекцыі славуты Г.К.Жукаў.

**— А як ідуць справы сёння?**

— За 70 гадоў на кафедры накоплены найбагацейшы вопыт па падрыхтоўцы афіцэраў запасу з ліку студэнтаў. І невыпадкова на працягу шэрага год ваенная кафедра БДУ па праву лічылася лепшай сярод кафедраў ВНУ былога Саюза. Не здаем заваяваных пазіцыі і зараз. Усё перадавое, станоўчае ў навучанне студэнтаў у сакрэце не трымаем. Наадварот, стараемся як мага хутчэй укараніць у навучальны працэс. Паспяхова вырашаюцца баявыя задачы на цыклах, якія ўзначальваюць палкоўнікі С.Л.Фядотка, М.Г.Лазараў, падпалкоўнік В.У.Талеронак — выпускнік БДУ.

**— Вячаслаў Сяргеевіч, што Вы можаце сказаць пра сваіх падначаленых?**

— Сёння, як ніколі, высокі навуковы патэнцыял прафесарска-выкладчыцкага саставу: прафесар, дацэнт, старэйшыя выкладчыкі — афіцэры, якія да прызначэння на кафедру займалі высокія пасады ў войсках. Многія з іх маюць сапраўдны баявы вопыт. Сярод іх — палкоўнікі А.Р.Шкураў, А.Д.Міронаў, Э.М.Элькін, У.М.Кудрэйка, В.А.Жалнярскевіч. У нас ёсць дыхтоўная навучальна-матэрыяльная база. Усё гэта дазваляе рыхтаваць сёння афіцэраў запасу па адзінаццаці спецыяльнасцях.

**— Ці згодны Вы з думкай, якая ходзіць сярод студэнтаў універсітэта, што лягчэй паступіць у ВНУ, чым на ваенную кафедру?**

— Рэч у тым, што за апошнія чатыры гады карэнна змянілася сістэма прыёму студэнтаў. Мы распрацавалі комплекс мераў, якія дазваляюць узняць якасную характарыстыку пры прафесійна-псіхалагічным адборы студэнтаў. Кваліфікаванае субяседванне, тэставанне па абранай спецыяльнасці, фізічная падрыхтаванасць і інш. — вось няпоўны пералік патрабаванняў, якія ставяцца да студэнтаў. Такая сістэма адбору ўхвалена кіраўніцтвам ВНУ і Міністэрствам абароны. Будзем яе і надалей удасканальваць.

**— Ці трэба разумець гэта так, нібы ў студэнтаў стане больш бар'ераў на шляху да ваеннай кафедры?**

— Аналіз кантынгенту студэнтаў, якія паступаюць на кафедру, паказвае, што патрабаванні, якія ставяцца да іх, па сілах тым, хто паспяхова вучыцца, цікавіцца ваеннай справай, дысцыплінаваны, духоўна і фізічна здаровы. Такіх студэнтаў мы сустракаем з распасцёртымі абдымкамі.

***Размаўлялі прафесар ваеннай кафедры Валерый Беспразванны, дацэнт Анатоль Конанаў***

*Семінары*

### "Адкрыць Беларусь"

У канцы верасня ў Мінску праходзіў беларуска-нямецкі маладзёжны семінар "Адкрыць Беларусь", які арганізавалі для нямецкіх студэнтаў з розных навучальных устаноў Германіі Камітэт па справах моладзі рэспублікі і Беларускі цэнтр міжнародных сувязяў Міністэрства адукацыі і навукі.

У рамках семінара адбылася цікавая сустрэча 15 студэнтаў з розных навучальных устаноў Германіі са студэнтамі факультэта журналістыкі нашага універсітэта.



Падчас сустрэчы

*Ведай нашых!*

Летам 1996 года ў Веспраме (Венгрыя) адбылася VIII Міжнародная алімпіяда школьнікаў па інфарматыцы (IOI-96). У ёй прынялі ўдзел 220 школьнікаў з 58 дзяржаваў. Нашу краіну прадстаўляла каманда, у якую ўваходзілі Віталь Бука (Маладзечанская гімназія Мінскай вобласці), Павел Лангер (ліцэй пры БДУ), Іван Міхневіч (ліцэй пры БДУ), Вячаслаў Чарной (Магілёўскі абласны ліцэй). Трэнер каманды — дацэнт кафедры матэматычнага забеспячэння САПР БДУ Уладзімір Міхайлавіч Котаў. Найлепшыя вынікі паказалі каманды Кітая і Расіі. Каманда Рэспублікі Беларусь прывезла адзін залаты медаль (В.Бука) і два срэбраных (І.Міхневіч, П.Лангер). За час удзелу беларускіх школьнікаў у міжнародных алімпіядах па інфарматыцы з 1990 года гэта ўжо трэці залаты медаль.

Цікава адзначыць, што адно з прызавых месцаў заняла каманда в'етнамскіх школьнікаў, кіраваў якой выпускнік аспірантуры кафедры МЗ САПР нашага універсітэта Нгуен Нгіа.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, фізікі паўправаднікоў, эканамічных навук;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі функцый, функцыянальнага аналізу;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, лікавых метадаў і праграміравання, матэматычнага забеспячэння САПР, тэорыі імавернасці і матэматычнай статыстыкі, вылічальнай матэматыкі, вышэйшай матэматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, ядзернай фізікі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ, заалогіі, беларускай літаратуры XX стагоддзя, рускай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, рускай мовы, замежнай літаратуры, эканамічнай геаграфіі замежных краін, міжнароднага права, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу (0,25 стаўкі), сацыялогіі, этыкі і эстэтыкі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, філасофіі і метадалогіі навукі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, ураўненняў матэматычнай фізікі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, беларускай літаратуры XX стагоддзя, гісторыі беларускай мовы, рускай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур, расійскай і славянскай гісторыі са старажытнага часу да пачатку XX стагоддзя, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: сучаснай беларускай мовы, прыкладной лінгвістыкі, замежнай літаратуры, славістыкі, гісторыі беларускай мовы, рамана-германскіх моў, фізічнай геаграфіі і аховы прыроды;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ (с/с), заалогіі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 2-26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" **10 кастрычніка** 1996 года.

## *Международная Соросовская программа образования в области точных наук*

## *International Soros sciense education program*

# Подпрограмма “Соросовские доценты”

Международная Соросовская программа Образования в Области Точных наук (ISSEP) в Беларуси объявляет конкурс на получение гранта “Соросовский доцент” теми преподавателями высшей школы, которые добились высоких показателей в обучении студентов по специальностям математика, физика, химия и биология.

Грант Соросовского доцента будет выделяться сроком на 10 месяцев.

Обязательными условиями для участия в конкурсе являются:

- наличие степени кандидата или доктора наук и работа в высшем учебном заведении в должности доцента (представляется копия аттестата доцента и справка о занимаемой должности);
- наличие не менеė трех публикаций в течение последних пяти лет: статей в отечественных реферируемых журналах (список журналов см. ниже) или в зарубежных периодических изданиях (исключая тезисы докладов на конференциях), книг по специальности, монографий, учебников;
- чтение основных лекционных курсов по физике, математике, химии, биологии и/или ведение практикумов и семинаров для студентов вузов (в совокупности не менее восьми академических часов в неделю на протяжении последних пяти лет).

Те, кто отвечает этим требованиям, могут заполнить анкету по прилагаемому образцу и отправить её до 1 ноября 1996 года (согласно почтовому штемпелю) в отделение ISSEP по адресу:

***220072, Минск, пр. Ф.Скорины, 66; справки по телефону: (0172) 268-57-45.***

При отборе кандидатов на получение звания “Соросовский доцент” будут приняты во внимание также следующие критерии:

- разработка новых лекционных курсов для студентов и их чтение, постановка новых практикумов, проведение семинарских занятий по новым дисциплинам и направлениям;
- публикация учебников, монографий, книг, подготовка методических пособий для студентов;
- подготовка научных кадров;
- оценка студентами лекций, семинаров, практикумов (опросы будут осуществлены сотрудниками ISSEP без участия соискателя);
- получение грантов на исследовательскую или педагогическую деятельность от отечественных и международных фондов;
- государственные и международные премии за учебники ,для школ или вузов, за научную или педагогическую деятельность;
- индекс цитирования работ кандидата;
- участие в международных конференциях и совещаниях с докладами.

Решение о присуждении грантов будет принято Международным Правлением Программы, выплата грантов будет осуществляться поквартально, начиная с 1 сентября 1996 года.

• • •

### *Список журналов, публикаций статей в которых будут приниматься во внимание Международной Соросовской Программой Образования в области точных наук*

Автоматика и телемеханика, Акустический журнал, Алгебра и анализ, Алгебра и логика (Сибирское отделение РАН), Архив анатомии, гистологии и эмбриологии (морфология), Астрономический вестник, Астрономический журнал, Астрофизика, Биологические мембраны, Биология моря, Биоорганическая химия, Биополимеры и клетка, Биофизика, Биохимия, Ботанический журнал, Бюллетень экспериментальной биологии и медицины, Бюллетень Московского общества испытателей природы (Серия биологическая), Вестник Московского университета (Серия 1. Математика. Механика, Серия 2. Химия, Серия 3. Физика. Астрономия, Серия 4. Геология, Серия 16. Биология. Серия 17. Почвоведение), Вестник Санкт-Петербургского университета (Физика, Химия), Вопросы вирусологии, вопросы ихтиологии, Вопросы медицинской химии, вопросы теории плазмы, Вулканология и сейсмология, Высокомолекулярные соединения (Серия А, Серия В), Генетика, Геологический журнал, Геология и геофизика, Геоморфология, Геотектоника, Геофизический журнал, Геохимия, Гидробиология, Гидрофизический журнал, Горный журнал, Дискретная математика, Дифференциальные уравнения, Доклады Академии наук Беларуси, Доклады Академии наук России, Доклады Академии наук СССР, Доклады Академии наук Украины, Журнал аналитической химии, Журнал Всесоюзного химического общества им. Д.И.Менделеева, Журнал высшей нервной деятельности им. И.П.Павлова, Журнал вычислительной математики и математической физики, Журнал микробиологии, эпидемиологии и иммунологии, Журнал неорганической химии, Журнал общей биологии, Журнал общей химии, Журнал органической химии, Журнал структурной химии, Журнал технической физики, Журнал физической химии, Журнал эволюционной биохимии и физиологии, Журнал экспериментальной и теоретической физики, Записки Всероссийского минералогического общества, Зоологический журнал, Известия АН Беларуси, Известия высших учебных заведений (География, Математика, Радиофизика, Радиоэлектроника, Физика, Химия и химическая технология), Известия РАН (Серия Биологическая, Серия Геологическая, Серия Математическая, Серия Механика жидкости и газа, Серия Механика твёрдого тела, Серия Физика атмосферы и океана, Серия Физика Земли. Серия Физическая, Серия Химическая, Известия Сибирского отделения АН СССР (Серия химических наук), Измерительная техника, Иммунология, Квантовая электродинамика, Кибернетика, Кинетика и катализ, Коллоидный журнал, Координационная химия, Космические исследования, Краткие сообщения по физике ФИАН им. П.Н.Лебедева, Кристаллография, Лазерная физика (на английском языке), Магнитная гидродинамика, Математические заметки, Математический сборник, Металлофизика, Метеорология и гидрология, Механика жидкостей и газов, Механика композитных материалов, Механика твёрдого тела, Микология и фитопатология, Микробиология, Минералогический журнал, Молекулярная биология, Молекулярная генетика, Микробиология и вирусология, Научные доклады, высшей школы: “Биологические науки”. Нейрохимия. Нейрофизиология, Неорганические материалы, Океанология, Онтогенез, Оптика атмосферы и океана, Оптика и спектроскопия, Палеонтологический журнал, Паразитология, Петрология, Письма в “Астрономический журнал”, Письма в “Журнал технической физики”, Письма в “Журнал экспериментальной и теоретической физики”, Поверхность, Физика, химия, механика, Почвоведение, Прикладная математика и механика, Радиационная биология, Радиоэкология, Радиотехника и электроника, Радиохимия,. Реакционная способность органических соединений, Сибирский математический журнал, Сверхпроводимость: физика, химия, техника, Сверхпроводники, Теоретическая и математическая физика, Теоретическая и экспериментальная химия, Теория вероятностей и её применение, Теория вероятностей и математическая статистика, Теплофизика высоких температур, Труды МИАН им. В.А.Стеклова, Труды Московского математического общества, Труды Санкт-Петербургского отделения Математического института им. В.А.Стеклова, Труды ФИАН им. П.Н.Лебедева, Украинский ботанический журнал, Украинский биохимический журнал, Украинский математический журнал, Украинский физический журнал, Украинский химический журнал, Успехи математических наук, Успехи современной биологии, Успехи физиологических наук, Успехи физических наук, Успехи химии, Фармакалогия и токсикология, Физика горения и взрывов, Физика и техника полупроводников, Физика металлов и металловедение, Физика низких температур, Физика твёрдого тела, Физика элементарных частиц и атомного ядра, Физиологический журнал, Физиология растений, Физиология человека, Функциональный анализ и его приложения, Физика Земли, Физика плазмы (на английском языке), Химико-фармацевтический журнал, Химическая физика, Химия гетероциклических соединений, Химия высоких энергий, Химия плазмы, Химия природных соединений, Цитология, Цитология и генетика, Экспериментальная биология, Электрохимия, Энтомологическое обозрение, Ядерная физика.

### Анкета кандидата на звание “Соросовский доцент”

Фамилия, имя, отчество участвующего в конкурсе на звание “Соросовский доцент”

____________________________________________

Год рождения________________________________

Образование, учёные степени и звания с указанием года их получения и № диплома ВАК

____________________________________________

Основная специальность__________________________

Общий стаж педагогической деятельности____________________

Место работы за последние 5 лет с указанием занимаемой должности (начните с последней)____________________________________

____________________________________________

Список лекционных курсов, семинарских занятий или практикумов для студентов за последние пять лет с указанием института, где читались лекции или проводились семинары и практикумы, и количества часов в неделю, потраченных на каждый из курсов, семинаров или практикумов

| Название лекционного курса, семинара или практикума (если курс, семинар или практикум был заново разработан, указать это под каждым названием) | Год | Название и располо жение вузов, в которых работал кандидат в Соро совские доценты | Число студентов, слушавших лекции или участвовавших в семинаре или практикуме |
|---|---|---|---|

Список лиц, защитивших кандидатские диссертации под руководством кандидата в Соросовские доценты с указанием названий диссертаций. В случае, если представляемый был соруководителем диссертаций, указать, кто был другим соруководителем (прилагаются копии титульных листов авторефератов диссертаций с оборотом).

Список публикаций за последние 5 лет (прилагаются копии или оттиски наиболее важных из них)____________________________________

Премии (государственные, международные и другие), награды________________

Полученные и ожидаемые гранты на исследования____________________

Список учебников для вузов и школ, практических руководств для студентов, монографий, подготовленных соискателем за весь период работы (прилагаются копии титульных листов)

____________________________________________

Участие в международных конференциях и совещаниях с докладами____________

Главные научные достижения соискателя______________________

Среднегодовой доход в 1995-1996 годах______________________

*Адрес, телефоны (рабочий и домашний), факс и e-mail кандидата в Соросовские доценты.*

**Примечание:** Соросовским доцентам — получателям грантов в 1994-1995 и 1995-1996 учебных годах, желающим участвовать в настоящем конкурсе, необходимо представить отдельно перечень лостижений за период получения гранта и последущее время с документальным подтверждением.

# *Іх класныя пакоі — метро, вуліцы, вакзалы...*

Сёння на бамжоў і жабракоў ужо мала хто звяртае ўвагу: прызвычаіліся. Іх можна сустрэць паўсюль: каля храмаў, у падземных пераходах і прама на вуліцах, а побач — шапка для міласціны. Зрэшты, некаторыя з іх не сядзяць у чаканні міласціны, а вынаходліва дзейнічаюць. Партыя фальшывых жабракоў сёння, верагодна, адна з найбольш масавых. Яна ўмацавалася і зацвердзілася. Яна даўно ўжо перамагла і не збіраецца здаваць свае пазіцыі. Там свае правы і законы, гэтаксама — як начальнікі і выканаўцы. І сярод іх — дзеці.

Калі зусім нядаўна нас палохаў разгул злачыннасці сярод 16-гадовых, цяпер іх месца занялі 7-10-гадовыя дзеці. Занялі трывала. Яны дасягаюць вялікіх поспехаў у збіранні пустых пляшак, мыцці машынаў і продажы цыгарэтаў. Аднолькава, як і на глебе крадзяжоў, бадзяжніцтва і хуліганства. І часцей яны выбіраюць менавіта гэты шлях — шлях падмана і злачыннасці, а “рабочымі месцамі” іх становяцца вакзалы і падземныя пераходы. Гэта ўлюбёныя месцы “працы і адпачынку” маленькіх папрашаек. Тут прасцей знайсці магчымасць выжыць, а таксама сустрэць паплечнікаў па промыслу. “Вакзальныя дзеці”... Гэта ўжо даўно замацавалася за імі.

Абарваныя і брудныя дзеткі жаласна стогнуць, жагнаюцца, кідаюцца ў ногі. Выканана прафесійна. Граюць выдатна і ролі свае ведаюць на памяць: “Дапамажыце на лячэнне”, “Хачу есці”, “Жыву з састарэлай бабушкай” і г.д. Мы таксама ведаем на памяць усе гэтыя фразы, яны круцяцца ў галаве, як надакучлівая тэлерэклама. А нядаўна мне давялося быць сведкай проста беспрэцэдэнтнага выпадку.

...Пасадка на электрычку “Мінск—Маладзечна” заканчвалася. Узяўшы штурмам вагон, пасажыры паселі, прыладкавалі рэчы. Прадаўцы газет яшчэ не з’явіліся. У гэты час у вагон і зайшоў хлопчык гадоў васьмі, звярнуўшыся да мужчыны, які сядзеў каля дзвярэй, са словамі: “Дайце мне тысячу рублёў, а то мяне мама заб’е”. Усялякае можна пачуць, але такое!.. Таму, канешне, разумееш, што гэта наіўны блеф. Але — потым. Разлік малагадовага псіхолага — менавіта на эфект нечаканасці. Шакіраваныя пасажыры яшчэ не паспявалі разумець, што да чаго, як хлопчык хутка праходзіў далей. Сабраўшы гэтак некалькі тысяч, ён перайшоў у наступны вагон.

У арыгінальнасці і спрыце, канешне, не адмовіш. І колькі такіх вось дзяцей просіць дапамогі, спасылаючыся на тое, што бацькі непрацаздольныя ці іх увогуле няма. Нехта, безумоўна, пашкадуе і кіне 1-2 тысячы ў брудную далоньку, нехта адмахнецца, але большая частка насельніцтва ўжо даўно не звяртае на гэтых дзяцей аніякай увагі, бо ведае: іх маці жывыя і здаровыя. А некаторыя, дзякуючы “працы” сваіх дзяцей, нават працвітаюць.

Не так рэдка даводзіцца назіраць і сустрэчы з “хворай і непрацаздольнай” гэткай “аберагальніцай ачага”, якой, ведама, і аддаецца выручка. А ці маці гэта на самой справе? Традыцыя браць дзяцей напракат качуе са стагоддзя ў стагоддзе... І як даведацца, хто перад табой: дзіця, якому сапраўды патрэбна дапамога, ці проста прафесійны ігрок? Памятаеце прытон у “Прыгодах Олівера Твіста” Чарльза Дыкенса, дзе навучалі крадзяжу беспрытульных дзяцей? Тыя часы мінулі? Хто ведае...

Ужо больш за месяц ідуць заняткі ў школах. Дзеці пасля летняга адпачынку селі за парты. Але — не ўсе. У “вакзальных дзяцей” нічога не змянілася: іх класныя пакоі — усё тыя ж метро, вуліцы, вакзалы... І ўсё па-ранейшаму.

А мы праходзім міма. Мы звыкліся з усім, мы змірыліся, стаміліся ці, можа быць, адчаяліся. Нам няма калі. У нас жа так шмат справаў. Сваіх. Праўда?

***Святлана Шаблінская***

*Конкурсы*

(Заканчэнне. Пачатак у № 13)

## II частка

# Жыціе Кубка "Несцеркі-96",

### або Хаджэнне студэнткі факультэта журналістыкі да інтэлектуалаў Беларусі

Гамяльчане смела могуць прэтэндаваць на званне лепшай беларускай каманды гэтага года. Сезон 1996 года прынёс "Злавесным сухарам" чэмпіёнства Гомеля, "Кубак Палесся" па "Што? Дзе? Калі?", чэмпіёнства "Белых начэй" у Санкт-Пецярбургу. Да слова, у "Паўночнай Венецыі" хлопцы пакінулі ў сябе за спіной каманды "Кітай-горад", "Юма", "Стырол". Дачакаўшыся, пакуль капітан "Сухароў" Анатоль Мядзведзеў штосьці высветліць з апеляцыйнай камісіяй, я задала яму некалькі пытанняў:

**— Анатоль, у чым сакрэт вашага такога ўдалага выступлення?**

— За тры гады, што гуляем, мы памянялі толькі аднаго чалавека. У гэтым плане я кансерватыўны. Я люблю шукаць унутры, а не знадворку. У кожнага з нас ёсць свой талент, і знайсці яго — мая задача. Тым больш, калі склад стабільны, то ў ігракоў з'яўляецца ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Хлопцы ведаюць: калі хто з іх прыхварэе і не вельмі добра згуляе пры адборы, яго не кінуць дома. Ён паедзе на турнір, а там ужо зробіць усё магчымае, каб яго гульня была высокай.

**— Скажыце некалькі слоў пра каманду.**

— У яе ўваходзяць Васіль Гайдукоў, Ігар Шпунгін, Андрэй Бялевіч, Андрэй Ражкоў, Генадзь Мішын — усе скончылі матфак Гомельскага універсітэта (акрамя Андрэя Ражкова, які вучыўся ў політэху). Трое — аспіранты, а астатнія працуюць. Калі сабраліся, вядома ж, паўстала праблема з назвай. Назвы ў іншых камандаў былі банальныя, а Васіль Гайдукоў прапанаваў такую неардынарную. Мы пагадзіліся.

**— Вы толькі-толькі размаўлялі з апеляцыйнай камісіяй. У вас праблемы з залічэннем адказаў?**

— Турнір праводзіцца на высокім узроўні, але хацелася б, каб пытанні праходзілі больш жорсткі адбор, таму што бываюць выпадкі, калі ёсць варыянты ў адказах.

І яшчэ неаднойчы я чула, што ігракі не бачаць логікі ў некаторых пытаннях, былі прэтэнзіі і да працы падліковай камісіі. А гэта падстава яшчэ раз пагутарыць з вядучым Яўгенам Зайцавым:

**— Яўген, хто складаў пытанні?**

— Была сабраная унікальная група пытальнікаў мінскага клуба, частка якіх — сертыфікаваныя пытальнікі міжнароднай асацыяцыі клубаў "Што? Дзе? Калі?". Аўтары пытанняў — Сяргей Сяродка, Мікалай Раманоўскі і ваш пакорлівы слуга.

**— Як я разумею, гэтыя тры чалавекі і складаюць апеляцыйную камісію?**

— Так. Таму што мы аўтары і ведаем у адказах кожную коску.

**— А хто ўваходзіць у падліковую камісію?**

— Ігракі, што тут не гуляюць. Збольшага гэта людзі з каманды "Разумнік", капітанам якой з'яўляюся я. Паколькі я вядучы і арганізатар "Несцеркі", я не магу ўдзельнічаць у гульні. А мая каманда вырашыла, што без мяне гуляць не будзе.

**— Яўген, я чула, што ў камандаў хапае прэтэнзій да пытанняў...**

— Іх не вельмі многа. Ёсць такое паняцце як запал барацьбы. іграк і не заўсёды могуць аб'ектыўна ацаніць сябе. Кожная каманда лічыць, што ёй не залічылі пытанне пытанне памылкова, але заўсёды згаджаецца з апеляцыйнай камісій, калі тая адхіляе апеляцыю іншай.

Перад тым, як перайсці да падзеяў другога дня спаборніцтваў, хачу крышку спыніцца на апісанні каманды з Віцебска "Брэйн-брэкерс". Хлопцы і дзяўчаты зрабілі амаль немагчымае: заняўшы ў кваліфікацыі толькі 51-е (!) месца, яны здолелі перабрацца на 4-е. "Брэйн-брэкерс" у перакладзе з галандскай азначае "галаваломшчыкі". Каманда сабралася ў лютым гэтага года, але ў сённяшнім складзе гуляе толькі трэці раз.

Брэйн-рынгаўскія баі праходзілі па алімпійскай сістэме: з выбыццём. Адпраўнай кропкай была 1/32 фінала. Дзень быў падзелены на дзве часткі: першая — гульні 1/32 і 1/16 фінала, другая — 1/8, чвэрць- і паўфіналы, бой за 3-е месца і фінал. Цікавасць гледачоў да першай часткі была невялікай. Выключэннем былі гульні фаварытаў, ды яшчэ зала выбухала смехам, калі каманды спрабавалі жартаваць. ("25 ліпеня 1917 года ў маскоўскіх газетах часта трапляліся лозунгі: "Дачнікі, не выязджайце! Спыніцеся! Сорамна выязджаць!" Якая важная для Масквы падзея адбывалася ў гэтыя дні?" — "Нашэсце каларадскіх жукоў",— быў адказ.)

Каманды, якія выступалі за БДУ, у першых жа баях панеслі адчувальныя страты: ні "Паняверкі", ні "Няміга" не здолелі прайсці ў 1/16 фінала. Праблемаў не было толькі ў "БДУ".

Заняўшы ў зале пост назіральніка паміж "Паняверкамі" і "Нямігай", я змагла даведацца ў іхніх капітанаў ацэнку гульні камандаў, калі турнір яшчэ быў у самым разгары. Аляксандр Гронскі ("Няміга"): "Учора згулялі проста выдатна. Па маіх падліках, мы абыгралі каля 7 камандаў вышэйшай лігі. А сёння гульня больш нервовая. Мы менш думалі, таму і атрымалася так". Яўген Скібскі ("Паняверкі"): "Разлічвалі, вядома, на перамогу ва ўсім. Але рэальна ацэньвалі шансы. У "Што? Дзе? Калі?" мы маглі перамагчы, але стаміліся ў паўфінале. А "Брэйн-рынг" — не наша гульня".

"Зашумела, загуло, бы землетрасенне",— сказаў бы Янка Купала, зайшоўшы ў актавую залу, дзе пачаліся гульні 1/8 фінала. Балельшчыкі больш не гарталі часопісы і не прабягалі вачыма газеты, а крычалі, свісцелі, смяяліся. Хапала і кур'ёзаў. Каманды "Брэйн-брэкерс" і "Майстар" па-сяброўску балелі, седзячы побач. Але пачуўшы ад Яўгена Зайцава, што яны — будучыя сапернікі, адразу разышліся ў розныя канцы залы.

Нашаму "БДУ" ў 1/8 фінала супрацьстаяла каманда "Легіён" з БДПА. За нашым столікам усе напружаныя, бо кожная памылка пагражае камандзе выбыццём. У пераломны момант гульні каманда свёй правільнай версіяй заглушыла гукі сірэны, Максім Ярохаў прайграў Герману Панчанкаву ў часе націскання на кнопку. Наша каманда згубіла апошнюю надзею рэабілітавацца за не вельмі ўдалую гульню напярэдадні.

У паўфінале каманда "Майстар" прайграла "Джокеру" з Магілёва, а "Фаэтон-Экспрэс" перамог віцебскі "Голдэн Медыум". У матчы за трэцяе месца ва ўпартай барацьбе перамаглі віцябляне. За некалькі хвілінаў да фіналу мы пазнаёміліся з адзінай дзяўчынай з "Медыума" Элеанорай Якушавай:

**— Элеанора, ведаю, вы сабраліся дзякуючы сваім выкладчыкам...**

— Так, у нас на факультэце вісела аб'ява, дзе гаварылася, што студэнты могуць выклікаць на спаборніцтвы выкладчыкаў. Так атрымалася, што нашы настаўнікі не з'явіліся. З гэтага пачаўся наш шлях у "Брэйн-рынг". Калі на некалькіх турнірах перамаглі, зразумелі, што гэта — наша жыццё.

**— Якімі якасцямі павінен валодаць ігрок "Брэйна"?**

— Ён павінен быць сабраны, уважлівы, мець шырокі кругагляд і глыбокія веды ва ўсіх галінах. Акрамя гэтага, каманду мусяць складаць ігракі разнапланавыя.

**— Вы дзяўчына, Вам, напрыклад, хочацца пагуляць з хлопцамі, а трэба бегчы на трэніроўкі...**

— У нас хапае прывабных хлопцаў. Так што праблемы тут няма. А пасля турніру мы плануем пайсці пагуляць па Мінску. Я тут упершыню.

У фінале каманда "Джокер" упэўнена пераіграла "Фаэтон-Экспрэс" (6:2). Але мяне прывабіў не пераможца, а каманда, якая заняла другое месца. Рэч у тым, што, хаця каманда лічыцца гомельскай, адзін з хлопцаў жыве ў Брэсце, а яшчэ адзін — мінчанін. А самае цікавае, што сабраліся яны ўсе разам толькі за дзень да пачатку турніру. Дзяніс Філіпенка, капітан каманды, запэўніў, што "Фаэтон" яшчэ не аднаму саперніку папсуе настрой.

Пасля фіналу было ўзнагароджанне пераможцаў. Не буду паўтарацца, бо імёны лепшых чытач "Беларускага універсітэта" ўжо ведае. Акрамя таго, каманды "Алімпія" і зборная Віцебска былі ўзнагароджаныя за самы актыўны ўдзел. А Беларускі Саюз моладзі падарыў па фотаапарату кожнаму іграку лепшай беларускай студэнцкай каманды "Голдэн Медыум" і лепшай мінскай студэнскай каманды "Легіён".

Як ні сумна, але аналізуючы табліцу пераможцаў, заўважаеш, што зноў толькі адна сталічная каманда змагла прабіцца ў васьмёрку лепшых — "Легіён" з Політэхнічнай акадэміі. Але было б несправядліва, калі б мы не прыгадалі ігракоў нашых камандаў. Я папрасіла капітанаў, каб яны назвалі лепшых у сваіх камандах: Наташа Арлова ("Няміга"), Дзмітрый Мазарчук ("Паняверкі"), Аляксей Сенчанка ("БДУ").




*Каманда "Фаэтон-экспрэс" і Я.Зайцаў пасля фіналу*

## Пасляслоўе

У пачатку артыкула я пісала, што па выніках "Несцеркі" будзе праводзіцца адбор для ўдзелу ў праграме Беларускага тэлебачання "Рызыка-версія". Пра гэта я распавядаць не буду: лепей адзін раз пабачыць...У бліжэйшы панядзелак "Паняверкі" памераюцца сіламі з маскоўскай камандай "Дубовы гай".

P.S. Аўтар артыкула дзякуе камандам "БДУ" і "Паняверкі" (і асабіста Максіму Ярохаву і Яўгену Скібскаму) за дапамогу пры зборы матэрыялаў і камандзе "Фаэтон-Экспрэс" (і асабіста Андрэю Някрасаву) за фотаздымкі.

***Вольга Каздзерка***

---



# Псіхалагічная дапамога: адчуваць сябе шчаслівым...

***У БДУ адкрылася і ўжо больш за месяц дзейнічае служба псіхалагічнай дапамогі студэнтам і супрацоўнікам. Якія задачы стаяць перад службай, з якімі праблемамі сёння можна прыйсці сюды — пра гэта мы размаўляем з Людмілай Савацьеўнай Краўчанка, кандыдатам псіхалагічных навук, дацэнтам кафедры псіхалогіі.***

**— Хто падаў ідэю стварэння такой службы?**

— Жыццё. Выкладчыкі-псіхолагі не выходзяць з аўдыторыі, не "абрастаюць" студэнцкімі праблемамі. Псіхалогія сёння не можа заставацца навукай акадэмічнай, псіхалагічныя веды могуць спатрэбіцца кожнаму чалавеку. Веды па псіхалогіі не могуць заставацца ў канспекце — гэта тое, што можа быць запатрабавана і з поспехам выкарыстана ў самых розных жыццёвых сітуацыях. І калі студэнты адразу пасля лекцыі звяртаюцца да выкладчыка з асабістымі праблемамі, абмяркоўваць іх на лесвіцы не толькі не прадуктыўна, але і безадказна. Часта гэта праблемы, якія патрабуюць дадатковага псіхалагічнага даследавання, прадуманай доўгай працы ў рэжыме псіхалагічнай кансультацыі або нават псіхатэрапіі. А гэта асаблівая дзейнасць, для якой патрабуюцца адпаведныя ўмовы.

Апрача таго, добра вядома, што ў мностве навучальных установаў ва ўсім цывілізаваным свеце існуюць асаблівыя псіхалагічныя службы, якія займаюцца і праблемамі адаптацыі, і прафесійнай арыентацыяй, і кансультаваннем па асабістых пытаннях, і трэнінгавай працай (трэнінг зносінаў, прафесійных навыкаў, вядзення перагавораў, вырашэння канфліктаў, інтэлектуальны трэнінг). У Іерусалімскім універсітэце, які можна параўнаць з БДУ па колькасці студэнтаў, псіхалагічная служба налічвае каля 20 супрацоўнікаў.

**— Вырашэннем якіх пытанняў будзе займацца служба псіхалагічнай дапамогі Белдзяржуніверсітэта? Ці не лічыце Вы, што зварот да псіхолага можа разглядацца як прызнанне асабістай слабасці або нават нездароўя: пайшоў да псіхолага — значыць, "псіх"?**

— На жаль, гэта дастаткова распаўсюджаная памылка, калі псіхалагічную дапамогу блытаюць з дапамогай псіхіятра. Псіхіятрычная дапамога сапраўды аказваецца людзям з псіхічнымі парушэннямі і расстройсвамі, тады як псіхалагічная дапамога адрасуецца звычайным людзям, праблемы якіх можна назваць агульначалавечымі. Толькі нехта для сябе вырашае, што можа справіцца з імі сам, а хтосьці, разумеючы, што гэтак жа, як мы з болем у страўніку можам атрымаць кваліфікаваную дапамогу тэрапеўта, з душэўным болем ідзе да псіхолага. І псіхолаг дапамагае разабрацца ў сабе, у невыпадковасці ўзніклых праблем, у пошуку шляхоў іх вырашэння; аказвае псіхалагічную падтрымку, нарэшце, проста выслухоўвае... Хаця псіхолаг, на самой справе, слухае зусім не "проста": чамусьці пасля таго, як Вы пабывалі ў яго на прыёме, усё дзіўным чынам расставілася па месцах. Вам стала зразумела, што рабіць, як быць далей... Вы чакалі ад псіхолага парады, рэкамендацыяў, інструкцыяў. І ён дапамог Вам, дапамог, паказаўшы, што Вы можаце вырашыць свае жыццёвыя цяжкасці, і маеце сілы і мужнасць адужаць сваю праблему, і самі ведаеце свой шлях.

Мы ўжо зараз аказваем дапамогу ў сітуацыі жыццёвых цяжкасцяў, кансультуем па асабістых праблемах (канфлікты, няўпэўненасць у сабе, неразуменне, адзінота і інш.). Гэта індывідуальная псіхалагічная дапамога. Разам з тым, у бліжэйшы час мы плануем правядзенне сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу для студэнтаў, якія маюць натуральныя праблемы ў зносінах (нехта лічыць, што ён кепска разбіраецца ў людзях, а будучаму педагогу ці арганізатару вытворчасці трэба быць і псіхолагам-практыкам; нехта не задаволены стаўленнем навакольных да сябе, а таму хацеў бы знайсці прычыну гэтага і змяніць сітуацыю і г.д.). Відавочна, гэта будзе відэатрэнінг, што значна больш эфектыўна, калі мець на ўвазе сацыяльна-псіхалагічную кампетэнтнасць навучэнцаў. У бліжэйшы час плануецца правядзенне сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу з арыентацыяй на фармаванне навыкаў прафесійных зносінаў, напрыклад, у будучых сацыёлагаў, юрыстаў ці псіхолагаў. Паколькі кожная прафесія мае на ўвазе не толькі пэўныя веды, але і ўменне рэалізаць іх у кантакце з іншымі людзьмі, такая спецыяльная псіхалагічная падрыхтоўка — гарантыя пасяховай прафесійнай дзейнасці. Мы таксама плануем правядзенне інтэлектуальных трэнінгаў (фармаванне навыкаў стратэгічнага мыслення ці прыняцця аператыўных рашэнняў і інш.), калі, канешне, на гэта будзе попыт з боку студэнтаў.

**— Людміла Савацьеўна, хто працуе ў службе? Ці ёсць у вас спецыяльнае абсталяванне, патрэбнае для відэатрэнінгу?**

— У службе псіхалагічнай дапамогі працуюць кваліфікаваныя спецыялісты, псіхолагі з вялікім стажам практычнай працы. І гэта не словы, як у некаторых распаўсюджаных рэкламных праспектах. Гэта сапраўдныя прафесіяналы, якія ў сваёй дзейнасці кіруюцца такімі прынцыпамі, як адказнасць, канфідэнцыйнасць, шчасце кліента. Апрача спецыялістаў у службе працуюць дыпламаваныя стажоры. Гэта выпускнікі Белдзяржуніверсітэта, якія маюць спецыяльную падрыхтоўку па праблемах псіхалагічнага кансультавання, а іх статус стажораў сёння вызначаецца толькі іх маладосцю і недахопам уласнага вопыту. Яны ажыццяўляюць запіс на прыём да спецыялістаў, а таксама бяруць на сябе пытанні псіхалагічнай дыягностыкі і кансультавання ў межах сваёй кампетэнтнасці.

Служба абсталяваная спецыяльным псіхалагічным інструментарыем і неабходнай апаратурай. Мы маем найлепшыя псіхалагічныя тэсты, арыентаваныя як на даследаванне інтэлектуальных магчымасцяў чалавека, так і на ягоную асабовую сферу. Гэта добра вядомыя спецыялістам і папулярныя ва ўсім свеце тэст на інтэлект Векслера, колеравы тэст Люшэра, асабовы і інтэлектуальны тэсты Кетэла і многія іншыя.

Напрыканцы хачу падкрэсліць, што наша служба аказвае падтрымку і псіхалагічную дапамогу не толькі студэнтам, але і супрацоўнікам універсітэта. Прафесійна, ананімна, бясплатна.

Мы размяшчаемся ў будынку бухгалтэрыі (вул. Бабруйская, 9), працуем з панядзелка па пятніцу з 12 да 18 гадзінаў. З 12 да 15 гадзінаў — час працы стажораў: запіс на прыём да спецыялістаў, папярэднія даследаванні і тэрміновая псіхалагічная дапамога. З 15 да 18 гадзінаў прыём вядуць спецыялісты.

***Распытвала Кацярына Ткачэнка***

